**Літаратура**

1 Беларуская мова: Энцыклапедыя / Беларус. энцыкл.; пад рэд. А. Я. Міхневіча; рэдкал.: Б. І. Сачанка (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : БелЭн, 1994. – 657 с.

2 Прыгодзіч, М. Р. Сэнс у іх хаваецца яшчэ большы, чым паэзія. Аўтарскія неалагізмы як факт мовы / М. Р. Прыгодзіч // Роднае слова. – 1995. – № 8. – С. 56–60.

3 Гілевіч, Н. С. Родныя дзеці : раман у вершах : для ст. шк. узросту / Ніл Гілевіч. – Мінск : Маст. літ., 2010. – 199 с.

4 Гілевіч, Н. Збор твораў. Т. 4. Сатыра і гумар 1948–2003 / Ніл Гілевіч. – Мінск : Маст. літ., 2003. – 334 с.

5 Гілевіч, Н. Выбраныя творы: у 2 т. / Н. Гілевіч. – Т 1: Вершы, паэмы, п’есы. – Мінск : Маст. літ., 1991. – 478 с.

**УДК 373.5.091.3:821.161.3-1*М.Багдановіч**

***М. М. Дыдышка***

# ВЫВУЧЭННЕ ТВОРЧАСЦІ МАКСІМА БАГДАНОВІЧА Ў СЁМЫМ КЛАСЕ

*У артыкуле акрэсліваюцца асноўныя метадычныя падыходы да вывучэння верша “Маёвая песня («Па-над белым пухам вішняў...»)” Максіма Багдановіча, якія прадугледжаны праграмай па беларускай літаратуры для сёмага класа. Адзначаюцца магчымыя шляхі работы з тропамі і пытаннямі тэорыі літаратуры. Аўтар прыходзіць да высновы аб неабходнасці вылучэння дзвюх гадзін на вывучэнне верша.*

Школьная праграма прадугледжвае знаёмства з творам “Маёвая песня («Па-над белым пухам вішняў…»)” Максіма Багдановіча ў сёмым класе [1]. У гэты перыяд вучні павінны асэнсаваць майстэрства паэта ў мастацкай перадачы навакольнага свету, яго прыгажосці і хараства. Таксама настаўнік павінен звярнуць увагу вучняў на ролю эпітэтаў, метафар і гукапісу ў тэксце, разгледзець вершаваны памер твора і яго рытмічныя асаблівасці. Важна зрабіць так, каб твор запомніўся вучням, бо гэта паспрыяе больш якаснаму вывучэнню літаратуры. В. Ляшук адзначае: “Сустрэчу з мастаком слова настаўніку неабходна зрабіць асабліва ўражваючай і па мажлівасці запамінальнай” [2, с. 5]. Верш “Па-над белым пухам вішняў…” прызначаны праграмай для завучвання на памяць, таму перад настаўнікам стаіць задача стварыць усе ўмовы для таго, каб максімальна паспрыяць больш хуткаму запамінанню твора.

На гэтым этапе вучні ўжо маюць уяўленне пра тое, хто такі Максім Багдановіч, таму лагічна пачаць урок з паўтарэння і актуалізацыі ведаў сямікласнікаў. Настаўнік прапануе вучням узгадаць, з якімі творамі паэта вучні знаёміліся ў пятым і шостым класе (вершы “Зімой” і “Вадзянік”). Калі настаўнікам была праведзена плённая праца над вывучэннем гэтых твораў, школьнікі змогуць узгадаць не толькі іх назвы, але і тэкст верша “Зімой”, таму што дзеці вучылі яго на памяць. Акрамя таго, яны павінны ўспомніць і тую інфармацыю з біяграфіі пісьменніка, якую падаваў настаўнік у ранейшых класах.

Для больш поўнага і глыбокага ўспрымання вучнямі верша “Па-над белым пухам вішняў…” мэтазгодна ўвесці такі этап урока, як псіхалагічная падрыхтоўка да ўспрымання матэрыялу. У вершы “Маёвая песня” пануе лёгкая, вясновая і яркая атмасфера, і настаўнік можа выкарыстаць гэты факт для эмацыянальнай падрыхтоўкі вучняў да знаёмства з творам. Зараз у сеціве існуе вялікая колькасць пейзажных відэаматэрыялаў, якія суправаджаюцца адпаведнай музыкай. Дадзены фармат відэа папулярны ў сацыяльных сетках, таму вучні не толькі адчуюць настрой верша, але і зацікавяцца тым, што далей

будзе адбывацца на ўроку. Напрыклад, кароткія відэаролікі ў сацыяльнай сетцы TikTok наступных аўтараў: longwalk.nature, Daniel Casson, dreamyvibes, teripohn і інш. У гэты момант настаўніку важна ўтрымаць настрой і ўвагу вучняў. Пасля прагляду відэа трэба даведацца аб тым, якія эмоцыі яно выклікала ў сямікласнікаў. Дапаможа ў дасягненні гэтай мэты рэпрадуктыўная гутарка ацэначнага характару.

“Пры выбары метадаў, прыёмаў і форм работы неабходна зыходзіць з дамінантнага спосабу ўздзеяння лірычнага тэксту на чытача” [3], – зазначае А. Брадзіхіна. Звернем увагу на тое, што ў вершы “Маёвая песня” пануе багатая мелодыка і яўна выражаны гукапіс, вядучым метадам на дадзеным уроку будзе чытанне. Для першаснага знаёмства з творам настаўнік павінен прачытаць яго на памяць класу. Абавязкова зрабіць гэта выразна, з адпаведнай вершу інтанацыяй. Педагогу важна ўразіць вучняў сваім чытаннем верша, каб выклікаць у іх яркую эмацыянальную рэакцыю і заматываваць на самастойнае завучванне верша. Пры першасным успрыманні твора вучні закрываюць свае падручнікі, яны павінны ўважліва слухаць настаўніка, а не сачыць за тэкстам твора. У адваротным выпадку дасягнуць патрэбнай эмацыянальнай рэакцыі не атрымаецца, бо ўвага школьнікаў будзе рассеяна.

Дадзены твор вельмі папулярны ў аматараў беларускай культуры, таму яго тэкст быў пакладзены на музыку. Сёння ў сеціве можна знайсці вялікую колькасць запісаў дадзенай песні ў выкананні самых розных музыкантаў: ад савецкіх да сучасных. Акрамя таго, дадзены твор прадстаўлены ў розных музычных жанрах, такіх як рок, поп, раманс, што дае настаўніку магчымасць выбраць менавіта тую аранжыроўку, якая будзе адпавядаць захапленням класа, або прадэманстраваць некалькі розных інтэрпрэтацый і потым абмеркаваць і параўнаць іх. Дадзены прыём паспрыяе развіццю творчага мыслення і развіццю кругагляду вучняў.

Пасля гэтага можна пераходзіць да аналізу верша “Маёвая песня («Па-над белым пухам вішняў…»)”. Вучні спачатку чытаюць верш самастойна. Як упаміналася вышэй, пры рабоце з гэтым творам чытанне павінна выступаць вядучым метадам. Таму мэтазгодна спачатку прапанаваць вучням прачытаць увесь верш самастойна, а пасля, выконваючы аналіз твора, выкарыстоўваць выбарачнае чытанне для аргументацыі думак школьнікамі.

Аналіз дадзенага верша пажадана праводзіць паслядоўным шляхам аналізу – ад страфы да страфы, каб захаваць цэласнасць створанай аўтарам карціны. Пасля гэтага настаўнік можа задаць вучням наступныя пытанні:

– Якую карціну вы ўяўляеце пры чытанні верша?

– Што дапамагае паэту паказаць чытачу адпаведныя малюнкі?

– Які настрой пануе ў першай страфе верша? і інш.

Перад урокам настаўнік можа стварыць карціны на падставе выпісанага ў вершы вясновага малюнка з дапамогай штучнага інтэлекту (Canva, Dream by Wombo, Craiyon) або стварыць іх разам з вучнямі прама на занятках, што стане матэрыялам для параўнання на этапе аналізу. Т. Логінава і Т. Мароз сцвярджаюць: “У вершы «Маёвая песня» М. Багдановіч спрабуе аб’яднаць у адно цэлае музыку і лірыку, карціну і гук. Гэты верш нельга пераказаць, не разбурыўшы яго арганізацыю. М. Багдановіч стварае зрокавыя і слыхавыя вобразы, якія паступова складаюцца ў адзіны цэласны вобраз – шматфарбны, шматгалосы свет, сагрэты сэрцам і пачуццямі паэта” [4, с. 126].

Далейшым крокам пры аналізе верша з’яўляецца вызначэнне і аналіз мастацкіх сродкаў. Верш “Маёвая песня” насычаны эпітэтамі. Вучні павінны не толькі знайсці іх усе, але і вызначыць іх ролю ў тэксце. Пры аналізе ролі мастацкіх сродкаў у творы, такіх як сінонімы, метафары і алітэрацыя, сямікласнікі павінны прыйсці да высновы, што з дапамогай гэтых сродкаў паэт малюе цэласную карціну вясновай прыроды, стварае ўражанне лёгкасці і прыгажосці. У вершы М. Багдановіч выкарыстоўвае шмат дзеясловаў, якія, па словах Т. Логінавай і Т. Мароз, “дапамагаюць перадаць узрушанасць, тэмп, хуткасць змены малюнкаў” [4, с. 127].

Тэарэтычны аспект, які вывучаецца школьнікамі ў сувязі з творам Максіма Багдановіча “Маёвая песня”, – гукапіс. Дзеці павінны засвоіць паняцці тропаў (эпітэтаў, метафар і параўнанняў) і ўласна гукапісу з такімі яго разнавіднасцямі, як асананс і кансананс. Гэтыя пытанні можна рыскрыць або праз тэарэтычную даведку, або праз каменціраванае чытанне артыкула ў падручніку, які пададзены менавіта пасля гэтага верша таму, што гукапісу належыць вядучая роля ў стварэнні атмасферы ў вершы М. Багдановіча. У “Маёвай песні” паэт стварае патрэбныя гукавыя ўражанні, выкарыстоўваючы паўтор зычных гукаў [ц], [ч], [з], [с], [ш], [х]. Дадзены прыём дапамагае аўтару аказваць максімальнае ўздзеянне на чытача і дапамагаць ва ўяўленні поўнай карціны твора.

Пасля правядзення гутаркі настаўнік і вучні спрабуюць стварыць “воблака тэгаў” з тропаў верша, абмяркоўваючы адметнасці кожнага мастацкага сродку і яго ролю ў творы. Асноўнымі тропамі, якія будуць выкарыстаны ў воблаку, з’яўляюцца эпітэты і метафары (малюнак 1).




Малюнак 1 – Воблака тэгаў

Наступным крокам у працы над вершам пасля яго аналізу можа выступаць праца над выразным чытаннем твора. Гэты этап з’яўляецца вельмі важным пры вывучэнні верша “Маёвая песня”. Варта ўлічыць, што гэты від дзейнасці не можа змяшчацца перад аналізам. “Выразнае чытанне і завучванне на памяць рэалізуецца на апошняй стадыі вывучэння тэксту, калі твор добра асэнсаваны” [3], – зазначае А. Брадзіхіна. Для таго, каб палегчыць гэтую задачу для сямікласнікаў, настаўнік разам з вучнямі можа распрацаваць партытуру верша, што дапаможа пры вывучэнні яго на памяць (табліца 1).

Табліца 1 – Партытура першай страфы верша

| Страфа верша,<br>дзе абазначаны паўзы, лагічны націск | Інтанацыя | Тэмп | Тон |
|---|---|---|---|
| Па-над белым пухам вішняў, /<br>Быццам сіні aганёк. /<br>Б’ецца, уецца шпаркі, лёгкі<br>Сінякрылы матылёк. | Усхваляванасці,<br>замілаванасці | Умераны | Мажорны |

Разам з вывучэннем верша “Маёвая песня” сямікласнікі знаёмяцца з тэарэтычнай тэмай “Вершаскладанне”. У межах яе вучні павінны асэнсаваць паняцці “рытм”, “стопы”, “памер”, “рыфма”, “страфа”, “вершаваны памер” і яго разнавіднасці – “ямб”, “харэй”,

“дактыль”, “анапест”, “амфібрахій”. Знаёмства з гэтымі тэрмінамі можна арганізаваць з дапамогай лекцыі ці каменціраванага чытання артыкула падручніка. Затым настаўнік павінен прапанаваць вучням вызначыць вершаваны памер твора “Маёвая песня” (чатырохстопны харэй) і знайсці рыфмы.

Такім чынам, да вывучэння верша Максіма Багдановіча “Маёвая песня («Па-над белым пухам вішняў…»)” настаўніку трэба падыходзіць з адпаведнай адказнасцю. Твор патрабуе выкарыстання міждысцыплінарных сувязей і падрабязнай прапрацоўкі тэарэтычных аспектаў – гукапісу, тропаў і тэорыі вершаскладання. Таму з прапранаваных праграмай дзевяці гадзін на раздзел “Паэзія. Разнастайнасць ідэйна-эстэтычнага пафасу паэтычных твораў” на вывучэнне гэтага верша можна адвесці дзве.

**Літаратура**

1 Вучэбная праграма па вучэбным прадмеце “Беларуская літаратура” для VII класа ўстаноў адукацыі, якія рэалізуюць адукацыйныя праграмы агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання і выхавання, зацв. Пастановай Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь 29.06.2023 № 181 [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу : https://adu.by/ru/homeru/obrazovatelnyj-protsess-2023-2024-uchebnyj-god/obshchee-srednee-obrazovanie/uchebnye-predmety-v-xi-klassy/belaruskaya-litaratura.html. – Дата доступу : 10.04.2024.

2 Ляшук, В. Я. Вывучэнне творчасці Максіма Багдановіча ў школе : дапам. для настаўнікаў / В. Я. Ляшук. – Мінск : Аверсэв, 2008. – 255 с.

3 Брадзіхіна, А. В. Методыка выкладання беларускай літаратуры: вучэбна-метадычны комплекс па вучэбнай дысцыпліне для спецыяльнасцей 1-02 03 03 Беларуская мова і літаратура. Замежная мова (англійская), 6-05 0113-02 Філалагічная адукацыя (Беларуская мова і літаратура. Замежная мова (англійская), 6-05-0232-01 Беларуская філалогія (па напрамках). Прафілізацыя: літаратурана-рэдакцыйная дзейнасць [Электронны рэсурс] / А. В. Брадзіхіна; М-ва адукацыі РБ; Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Ф. Скарыны. – Гомель: ГДУ імя Ф. Скарыны, 2012. – Рэжым доступу: https://dot3.gsu.by/course/view.php?id=5849. – Дата доступу: 15.04.2024.

4 Беларуская літаратуры ў 7 класе: дапам. для настаўнікаў устаноў, якія забяспечваюць атрыманне агул. сярэдн. адукацыі, з бел. і рус. мовамі навучання / Т. У. Логінава, Т. І. Мароз. – 2-е выд., перапрац. – Мінск : Сэр-Вит, 2007. – 336 с.

**УДК 373.5.091.33-028.22**

***М. П. Ежова***

## ИССЛЕДОВАНИЕ РОЛИ НАГЛЯДНЫХ СРЕДСТВ ОБУЧЕНИЯ СРЕДИ УЧАЩИХСЯ 5–9 КЛАССОВ

*Статья посвящена исследованию роли наглядных средств обучения среди учащихся среднего звена в современной школе. В статье приведены характерные особенности наглядных средств обучения, раскрыта специфика их применения в зависимости от изучаемого материала и возрастных психофизиологических особенностей школьников. Значение роли наглядных средств обучения исследовано на примере анкетирования учащихся гимназии № 56 города Гомеля им. А. А. Вишневского.*

Тема роли наглядных пособий в учебном процессе освещалась ещё с времен античности. Казалось бы, тема изучена, но она остаётся не менее актуальной и сегодня.